31. EUFOR LOT & MTT [Electronic resource] // Swiss Armed Forces. – Mode of access: https://www.vtg.admin.ch/en/news/einsaetze-und-operationen/militaerische-friedensfoerderung/missionen/eufor.html. – Date of access: 18.02.2018.

32. Bundesgesetz über die Armee und die Militärverwaltung (Militärgesetz) vom 3. Feb. 1995: Stand am 1. Jan. 2018 // Systematische Rechtssammlung. – SR 510.10.

33. Volksabstimmung vom 10.06.2001 [Electronic resource] // Bundeskanzlei. – Mode of access: https://www.bk.admin.ch/ch/d/pore/va/20010610/index.html. – Date of access: 18.02.2018.

34. Volksabstimmung vom 03.03.2002 [Electronic resource] // Bundeskanzlei. – Mode of access: https://www.bk.admin.ch/ch/d/pore/va/20020303/index.html. – Date of access: 18.02.2018.

35. Bericht des Bundesrates an die Bundesversammlung über die Konzeption der Armee in den neunziger Jahren (Armeeleitbild 95) vom 27. Jan. 1992 // Schweizerisches Bundesarchiv. – BBl 1992 I 850. – S. 850–1015.

36. Bericht des Bundesrates an die Bundesversammlung über die Konzeption der Armee XXI (Armeeleitbild XXI) vom 24. Okt. 2001 // Generalsekretariat VBS. – BBl 2002 967. – S. 967–1051.

37. «Weiterentwicklung der Armee»: Bundesrat beschliesst weitere Schritte für rasche Umsetzung [Electronic resource] // Der Bundesrat. – Mode of access: https://www.admin.ch/gov/de/start/dokumentation/medienmitteilungen.msg-id-68905.html. – Date of access: 18.02.2018.

38. Bericht des Bundesrates an die Bundesversammlung über die Sicherheitspolitik der Schweiz vom 23. Jun. 2010 // Direktion für Sicherheitspolitik. – BBl 2010 5133. – S. 5133–5222.

39. Die Sicherheitspolitik der Schweiz: Bericht des Bundesrates vom 24. Aug. 2016 // Generalsekretariat VBS. – BBl 2016 7763. – S. 7763–7888.

40. Swiss foreign policy strategy 2016-19: Federal Council report on the priorities for the 2016-19 legislative period / Swiss Federal Department of Foreign Affairs. – Bern: FDFA, 2016. – 40 p.

41. Aussenpolitischer Bericht vom 15. Jun. 2007: Neutralität // Politische Abteilung III – BBl 2007 5557. – S. 5557-5564.

**(Дата подачи: 26.02.2018 г.)**

*У. У. Караленак*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*U. Karalenak*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476)«14/18»**

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ НЯСВІЖСКАЙ АРДЫНАЦЫІ РАДЗІВІЛАЎ

# HISTORIOGRAPHY OF THE NIASVIZH FEE TAIL OF RADZIWIŁŁ FAMILY

*Артыкул прысвечаны агляду беларускай і замежнай гістарыяграфіі нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў. Асаблівая ўвага надаецца навейшым публікацыям, якія на падставе шырокага кола архіўных крыніц падрабязна аналізуюць гаспадарчы стан маёнткаў, карціну сямейнага жыцця Радзівілаў, грамадскае жыццё рэгіёна,*

*спецыфіку радзівілаўскага патраната і мецэнатства. Разглядаецца шэраг малавядомых гістарычных прац. Аўтар звяртае ўвагу на тое, што ў даследаваннях назіраецца рух да міждысцыплінарнасці і вывучэння паўсядзённага жыцця.*

*Ключавыя словы: Радзівілы; гістарыяграфія; ардынацыя; Нясвіж.*

*The article deals with a review of Belarusian and foreign historiography of Niasvizh fee tail of the Radziwiłłs. Special attention is paid to the newest publications, which provide a detailed analysis of the household conditions of the estates, scenes of the Radzilwłłs' family life, social life of the region, peculiarities of the Radziwiłłs' patronage and patronship of arts, based on a wide range of archive sources. The article reviews a number of little-known historical investigations. The author pays attention that in the research there are tendencies to transdisciplinarity and the study of everyday life.*

*Key words: the Radziwiłłs; historiography; fee tail; Niasvizh.*

Нясвіжская ардынацыя стала адным з першых буйных зямельных уладанняў у Рэчы Паспалітай, у якіх прынцып фідэікаміса замацоўваў ва ўладанні сям'і непадзельную і неадчужальную маёмасць. Паколькі сядзібы ў складзе ардынацыі нельга было прадаць, то агромністы масіў маёнткаў з'яўляўся ўстойлівай тэрытарыяльнай адзінкай на працягу некалькіх стагоддзяў.

Часам стварэння трох першых ардынацый князёў Радзівілаў (нясвіжская, клецкая, алыцкая) лічыцца 1586 год, так як дамова братоў Радзівілаў была замацавана каралеўскім подпісам 10 снежня 1586 г. Аднак канчаткова юрыдычнае прызнанне нясвіжскай ардынацыі адбылося на ардынарным сойме, які праходзіў з 6 сакавіка па 23 красавіка 1589 г. у Варшаве. Існаванне нясвіжскай ардынацыі было спынена 13 ліпеня 1939 г. у сувязі з законам аб ліквідацыі ардынацый у ІІ Рэчы Паспалітай, а 17 верасня 1939 г. апошні сямнаццаты нясвіжскі ардынат страціў кантроль над сваімі маёнткамі.

Часовы адрэзак існавання нясвіжскай ардынацыі (1586–1939) умяшчае некалькі гістарычных эпох, а захаванне нясвіжскай ардынацыі юрыдычна было пацверджана ў Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі і ІІ Рэчы Паспалітай. У сувязі з тым, што нясвіжскія ардынаты з'яўляліся буйнымі мецэнатамі, палітычнымі і ваеннымі дзеячамі, а іх прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы з'яўляліся аднымі з самых вялікіх у рэгіёне, існуе даволі грунтоўная гістарыяграфія нясвіжскай ардынацыі. Можна вылучыць тры асноўныя катэгорыі навуковых даследаванняў:

• прысвечана непасрэдна прадстаўнікам роду Радзівілаў, нясвіжскім ардынатам, іх жонкам і бліжэйшыму атачэнню;

• закранае пытанні сацыяльна-эканамічнай дзейнасці і адносін на тэрыторыі нясвіжскай ардынацыі;

• асвятляе гісторыю культуры і мастацтва.

Вывучэнню роду Радзівілаў у сучаснай беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі прысвечаны артыкул В. Кахновіча [1]. Польская гістарыяграфія праблемы з'яўлення роду Радзівілаў на палітычнай арэне Вялікага Княства Літоўскага разглядалася М. Антаневічам [2]. Агляд нямецкамоўных і польскамоўных крыніц зрабіла В. Папко [3].

У развіцці гістарыяграфіі, прысвечанай роду Радзівілаў, вылучаецца шэраг абагульняючых гістарычных работ навукова-папулярнага характару, а таксама міждысцыплінарныя і трансдысцыплінарныя гістарычныя даследаванні. Да першых можна аднесці працы Э. Катлубая, Б. Таўрагінскага, С. Мацкевіча, Т. Навакоўскага і К. Стэмпніка [4–8]. У гэтым рэчышчы можна разглядаць кнігу «Уладальнікі Старога Нясвіжа» А. Мяцельскага, якая карыстаецца шырокай папулярнасцю і вытрымала ўжо некалькі перавыданняў [9]. Таксама адзначым кнігу «Радзівілы герба Трубы» С. Гуржыньскага, В. Піўкоўскага, Т. Зяліньскай, І. Гралы і В. Урбаняк, якая найбольш поўна разглядае гісторыю роду Радзівілаў і артыкулы польскага біяграфічнага слоўніка аб Радзівілах [10].

Што датычыцца непасрэдна генэзісу нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў, то ўпершыню дадзеныя пытанні былі актуалізаваны ў кнізе «Ардынацыі ў старой Польшчы» А. Меленя [11]. Фарміраванне нясвіжскай ардынацыі таксама разглядаліся ў шэрагу артыкулаў М. М. Сякерскага, манаграфія якога «Зямельныя ўладанні ў Вялікім Княстве Літоўскім: эканоміка князя Мікалая Хрыстафора Радзівіла» глыбока раскрывае прычыны з'яўлення велізарнага комплексу зямель Радзівілаў [12–14]. Латыфундыі Радзівілаў XV – першай паловы XVI ст. таксама прысвечаны даследаванні М. Мальчэўскай [15]. Гісторыю нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў XIX ст. разглядае В. Папко [16]. Эканамічныя і гаспадарчыя аспекты гісторыі нясвіжскай ардынацыі XIX – пач. XX ст. даследуе В. Кахновіч [17; 18]. У 2014 г. на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта была абаронена дысертацыя А. Верамейчык «Нясвіжская ардынацыя Радзівілаў (1586–1814): фарміраванне тэрыторыі, адміністрацыйнае кіраванне і сацыяльна-эканамічнае развіццё», якая стала першай абагульняючай навуковай працай аб нясвіжскай ардынацыі на рускай мове [19].

Палітыку Радзівілаў у адносінах да гараджан Нясвіжа закранаў А. Грыцкевіч у кнізе «Прыватнаўласніцкія гарады Беларусі ў XVI–XVIII стст.» [20]. Аб адносінах яўрэяў і хрысціян у нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў піша В. Сабалеўская і А. Тэлер, а кніга апошняга «Грошы, улада і ўплыў у Літве XVIII ст.: яўрэі ў радзівілаўскіх маёнтках», з'яўляецца важнай не толькі ў кантэксце юдаікі, але і для разумення ролі яўрэяў у структуры нясвіжскай ардынацыі XVIII стагоддзя [21; 22]. Адміністрацыя і штодзённае жыццё ў маёнтках Радзівілаў цікавіла У. Аўгустыняк, а каталіцкаму кліру, які ўдзельнічаў у выхаванні і адукацыі дзяцей ардынатаў, прысвечаны працы польскага гісторыка К. Стоек-Савіцкай [23–25]. Вывучэннем масонскіх ложаў на тэрыторыі радзівілаўскіх уладанняў і ўдзелу ў іх радзівілаўскай адміністрацыі, урачоў і інш. займаецца В. Швед [26].

Сярод гісторыкаў мастацкай літаратуры неабходна вылучыць артыкулы і кнігі А. Сайкоўскага, Г. Барышава, Ж. Некрашэвіч-Кароткай, С. Кавалёва, Н. Русецкай, Б. Юдковяк, В. Клёцкінай, В. Арэшкі, якія вывучалі літаратурную і тэатральную творчасць Францішкі Уршулі Радзівіл і эвалю-

цыю музычнай і тэатральнай культуры ў Нясвіжы [27–36]. Аб музычнай спадчыне дванаццатага нясвіжскага ардыната Антонія Генрыха Радзівіла пісалі У. Скарабагатаў, З. Яхімецкі і В. Позьняк [37; 38]. Вялікі ўнёсак у даследаванне гісторыі радзівілаўскай музыкі зрабіла доктар габілітаваны, ад'юнкт Інстытута музыказнаўства Варшаўскага ўніверсітэта І. Бянькоўска [39; 40].

А. Мальдзіс у кнізе «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: нарысы быту і звычаяў» і Б. Крулікоўскі ў кнізе «Сярод сарматаў: Радзівілы і мэмуарысты» шмат у чым у рэчышчы гісторыі штодзённасці прадставілі карціну рэальнай мазаікі living разнабаковага паўсядзённага жыцця нясвіжскіх ардынатаў і іх блізкіх [41; 42].

Сярод усіх эга-дакументаў Радзівілаў памерамі і храналагічнай дакладнасцю вылучаецца дзённік нясвіжскага ардыната Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі, падрыхтоўкай да публікацыі фрагментаў якога займаліся В. Арэшка і Е. Дыгдала [43; 44]. Неабходна таксама згадаць аб дзённіках падарожжаў, якія вялі нясвіжскія ардынаты. Аб ролі «перэгрынацыі» першага нясвіжскага ардыната Мікалая Хрыстафора Радзівіла ў рускай літаратуры XVII – пачатку XVIII ст. пісала І. Фёдарава, а пра рэлігійныя ўяўленні і грамадска-палітычныя погляды князя на падставе тэксту перэгрынацыі С. Ганчарэнка [45–47]. Публікацыю дзённіка еўрапейскай перэгрынацыі восьмага нясвіжскага ардыната Караля Станіслава Радзівіла з сур'ёзным навукова-даведачным апаратам прадставіў А. Кухарскі, а дзённік падарожжа сястры Пане Каханку Тэафіліі Мараўскай па Еўропе падрыхтаваў да выдання Б. Рок [48; 49]. Пытанні замежнай адукацыі Радзівілаў пачатку XVI – сярэдзіны XVII ст. разглядае М. Хахай [50].

Аналізам і публікацыяй карэспандэнцыі нясвіжскіх ардынатаў гісторыкі пачалі займацца яшчэ напрыканцы XIX – пачатку XX стст. (Е. Мыцельскі, Ч. Янкоўскі, К. Валішэўскі, А. Курпель і інш.) [51–54]. З апошніх прац на дадзеную тэматыку прыгадаем артыкулы Б. Манысь аб сямейных клопатах, адлюстраваных у лістах Ганны Радзівіл з Мыцельскіх да мужа – дзявятага нясвіжскага ардыната Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі, А. Марыяні і Я. Баера аб яе французскай карэспандэнцыі пасля яго смерці і артыкулы Б. Рока пра ліставанні Тэафіліі з дому Радзівілаў (primo voto Мараўская, secundo voto Развадоўская) з адзінаццатым нясвіжскім ардынатам Дамінікам Радзівілам і інш. [55–59].

Важнай публікацыяй у рэчышчы гісторыі штодзённасці з'яўляецца выданне рукапісу кухмістра нясвіжскага замка канца XVII ст., падрыхтаванага Я. Думаноўскім і Р. Янкоўскім [60]. Дадзены твор з'яўляецца першай кулінарнай кнігай, напісанай на тэрыторыі Беларусі.

Тэстаменты жонак Радзівілаў у рэчышчы гісторыі магнацкай ментальнасці даследуе М. Александровіч-Шмулікоўска, а важную для Радзівілаў пахавальную культуру разглядаюць у сваіх артыкулах М. Ярчык і К. Стоек-Савіцка; пра стаўленне да смерці ў культуры Рэчы Паспалітай пісаў Б. Рок [61–64].

Шэраг знакавых прац аб сталіцы нясвіжскай ардынацыі напісаў Т. Бернатовіч, у якіх як мастацтвазнаўца, услед за польскім гісторыкам культуры Р. Афтаназы, звяртае ўвагу на гісторыка-культурнае і семантычнае значэнне прасторы, сфармаванай ардынатамі ў Нясвіжы [65–67]. З каштоўнаснымі арыенцірамі і мастацкімі калекцыямі нясвіжскіх ардынатаў знаёмяць кнігі «Радзівілаўскі Нясвіж. Роспісы касцёла Божага Цела» В. Бажэнавай і «Радзівілы. Нясвіж. Замак» Н. Высоцкай [68; 69]. Асобна трэба вылучыць выданне пад навуковай рэдакцыяй В. Бажэнавай факсімільнага альбома «Радзівілы. Альбом партрэтаў XVIII–XIX стагоддзяў» [70]. Акрамя гэтага, радзівілаўскім калекцыям і зборам цалкам прысвечаны сёмы выпуск зборніка «Вяртанне» [71].

У рэчышчы палітычнай гісторыі працуе А. Малейка, які даследуе палітычную дзейнасць нясвіжскіх ардынатаў у гады праўлення Яна III Сабескага, і А. Мацук, які аналізуе палітычнае змаганне Радзівілаў з Сапегамі і іншымі магнатамі ВКЛ [72–74].

Сярод даследаванняў па гендэрнай і жаночай гісторыі вылучаецца кніга «Шляхцянкі ў сармацкім свеце» К. Стоек-Савіцкай [75]. Аб жонках нясвіжскіх ардынатаў пісаў Я. Петшак (аб жонцы сёмага нясвіжскага ардыната Кацярыне Радзівіл з роду Сабескіх), В. Каркуцінская і Е. Дыгдала (аб жонцы восьмага нясвіжскага ардыната Ганне Радзівіл з роду Сангушак), М. Ястржэмбска (аб жонцы адзінаццатага нясвіжскага ардыната Тэафіліі Радзівіл з роду Мараўскіх) і Г. Эрбэ (аб жонцы чатырнаццатага нясвіжскага ардыната Марыі-Дароце Радзівіл з роду Кастэлян) [76–80]. У кнігах прааналізаваныя сямейныя ўзаемаадносіны, гаспадарчая дзейнасць і мецэнацтва жонак нясвіжскіх ардынатаў. Мецэнацтву Радзівілаў ад Сіроткі да Рыбанькі таксама прысвечана кніга А. Сайкоўскага [81].

Ваенныя пытанні гісторыі роду Радзівілаў – абароназдольнасць нясвіжскага замка і іншых фартэцый Радзівілаў у кантэксце Вялікага Княства Літоўскага – разглядае М. Волкаў у кнізе «Артылерыя Нясвіжскага замка» [82]. Аб фартыфікацыі нясвіжскага замка ў канцы XVI–XVIII стст. пісаў таксама У. Пярвышын [83]. Ваенныя фарміраванні Радзівілаў у каронным войску апісвае польскі гісторык З. Хундэрт [84]. Дзейнасці нясвіжскіх ардынатаў як ваеначальнікаў прысвечаны артыкулы Т. Цясельскага, К. Бабятыньскага, а артыкулы В. Арганісцяка і В. Ракуціса – розным пытанням гісторыі радзівілаўскай міліцыі [85–88].

Глыбокім даследчым узроўнем адрозніваюцца артыкулы беларускага гісторыка А. Латушкіна, які займаецца вывучэннем архіва Нясвіжскай ардынацыі [89]. Нясвіжскай ардынацкай бібліятэцы прысвечаны артыкулы П. Бухвальд-Пяльцовай, Н. Бярозкінай і С. Сіеса-Крышкоўскага [90–92]. Шэраг каталогаў былога радзівілаўскага кнігазбору выдадзены бібліятэкай РАН у Санкт-Пецярбургу, а таксама Цэнтральнай навуковай бібліятэкай імя Якуба Коласа НАН Беларусі ў межах праекта «Радзівіліяна».

Неабходна таксама спыніцца на выданнях, якія ў значнай ступені прысвечаны радзівілаўскай тэматыцы. Гэта зборнікі канферэнцый, якія праводзіліся музеем-запаведнікам «Нясвіж», Замкавым комплексам «Мір», нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкай ім. Паўлюка Пранузы. Дзякуючы дзейнасці музея Замкавы комплекс «Мір» была выдадзена дапоўненая і перакладзеная на беларускую мову фундаментальная біяграфія першага нясвіжскага ардыната аўтарства польскага гісторыка Томаша Кэмпы [93]. Таксама цэлы шэраг аўтараў апублікаваў свае працы па гісторыі нясвіжскай ардынацыі на старонках навуковага штогодніка музея-запаведніка «Нясвіж» «Acta anniversaria».

Радзівілаўскай тэме быў прысвечаны цэлы шэраг канферэнцый, якія прайшлі ў апошнія гады на тэрыторыі Літвы («Kunigaikščiai Radvilos Garsiausia Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės didikų giminė», Vilnius, 2015), Беларусі («Жанчыны ў гісторыі роду Радзівілаў», Нясвіж, 2016), Польшчы («Radziwiłłowie w służbie Marsa», Warszawa, 2015) і Украіны («Олика та Радзивілли в історії України, Польщі й Білорусі», Луцк, 2017).

У гістарычных даследаваннях, прысвечаных нясвіжскай ардынацыі ў апошнія гады ўсё больш заўважаецца пераход да вывучэння паўсядзённага жыцця «маленькага чалавека», які традыцыйна губляўся раней у гісторыі (артыкулы С. Рыбчонка, А. Скеп’ян, Л. Балайшыце) [94–96]. Разам з тым частка гісторыкаў не перастае факусавацца на войнах, вялікіх прадстаўніках роду, і палітыцы, якія былі здаўна галоўным аб’ектам гістарыяграфіі, аднак вызначаецца напрамак міждысцыплінарнасці (шырока выкарыстоўваюцца спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны). Адбываецца пабудова глабальнай сістэмы даследаванняў без строгіх межаў паміж дысцыплінамі гістарычнага пазнання.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Кохнович, В. А.* Изучение Радзивиллов в современной белорусской и украинской историографиях / В. А. Кохнович // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. – Сер. 3. – 2011. – № 2. – С. 15–19.

2. *Antoniewicz, M.* Protoplaści książąt Radziwiłłów. Dzieje mitu i meandry historiografii / M. Antoniewicz. – Warszawa: DiG, 2011. – 423 s.

3. *Папко, В. М.* Нямецкамоўныя і польскамоўныя крыніцы па гісторыі рода Радзівілаў XIX ст. / В. М. Папко // Repatriacje i migracje ludności pogranicza w XX wieku: Stan badań oraz zródla do dziejów pogranicza polsko-litowsko-białoruskiego: mat-ly konfer.: W 3 t. / Naczelna Dyrekcja Archiwów Państwowych w Warszawie; pod red. M. Kietlińskiego. – Bialystok, 2004. – Т. 3. – С. 186–190.

4. *Kotłubaj, E.* Galerja Nieświeżska portretów Radziwiłłowskich opisana historycznie przez Edwarda Kotłubaja z drzeworytami Michała Starkmana / E. Kotłubaj. – Wilno: Druk. A. Marcinowskiego, 1857. – 558 s.

5. *Tauroginski, B.* Z dziejów Nieświeża / B. Tauroginski. – Warszawa: Archiwum Ordynacji Nieświeskiej (Drukarnia Bagatela), 1937. – 268 s.

6. *Mackiewicz, S.* Dom Radziwiłłów / S. Mackiewicz. – Warszawa: Czytelnik, 1990. – 253 s.

7. *Nowakowski, T.* Die Radziwills: die Geschichte einer grossen europäischen Familie / T. Nowakowski. – München: Deutscher Taschenbuch Verlag, 1975. – 386 s.

8. *Stępnik, K.* Radziwiłłowie: obrazy literackie, biografie, świadectwa historyczne / K. Stępnik. – Lublin: Wydaw. Uniwersytetu Marii Curie–Skłodowskiej, 2003. – 503 s.

9. *Метельский, А. А*. Владельцы старого Несвижа / А. А. Метельский. – Минск: Беларуская Энцыклапедыя, 2014. – 159 с.

10. Radziwiłłowie herbu Trąby / S. Górzyński [et al.]. –Warszawa: DiG, 1996. – 67 s.

11. *Mełeń, A*. Ordynacje w dawnej Polsce / A. Mełeń // Pamiętnik historyczno-prawny. – Lwów. – Zeszyt 2, 1929. – T. VII. – 62 s.

12. *Siekierski, M. M.* The niasvizh estates of prince Nicholas Christopher Radziwill: the formation of a byelorussian latifundium / M. M Siekierski // The Journal of Byelorussian Studies. – 1978. – Vol. IV, № 2. – P. 48–67.

13. *Siekierski, M.* –M. The estate of Lachwa of prince Nicholas Christopher Radziwill (1549–1616) / M. M. Siekierski // The Journal of Byelorussian Studies. – 1981. – Vol. V, № 1. – P. 19–28.

14. *Siekierski, M. M*. Landed wealth in the Grand Duchy of Lithuania: The economic affairs of prince Nicholas Christopher Radziwill, 1549–1616: Dissertation Ph. D. / M. M. Siekierski. – Berkeley, 1984. – 404 p.

15. *Malczewska, M*. Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku / M. Malczewska. – Warszawa: Państ. Wydaw. Naukowe, 1985. –169 s.

16. *Папко, В. М*. Нясвіжская ардынацыя князёў Радзівілаў у ХІХ стагоддзі / В. М. Папко // Беларус. гіст. часоп. – 2006. – № 1. – С. 30–36.

17. *Кохнович, В. А*. Хозяйство и доходы Радзивиллов в ХІХ – начале ХХ ст. / В. А. Кохнович // КЛИО. – 2012. – № 4. – С. 46–54.

18. *Кахновіч, В. А*. Нясвіжская ардынацыя Радзівілаў у час апекі над ёй Эдварда Вайніловіча (1904–1914) / В. А. Кахновіч // Беларусь, Нясвіжскі край і Эдвард Вайніловіч: матэрыялы навук.-практ. канф., г. Нясвіж, 26 жніўня 2016 г. / Інстытут гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Медысонт, 2016. – С. 40–57.

19. *Веремейчик, А. Е*. Несвижская ординация Радзивиллов (1586–1814 гг.): формирование территории, административное управление и социально-экономическое развитие: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А. Е. Веремейчик. – Мінск, 2014. – 165 л.

20. *Грицкевич, А. П*. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв.: Соц.–экон. исслед. истории городов / А. П. Грицкевич. – Минск: Наука и техника, 1975. – 248 с.

21. *Соболевская, О. А*. Иудеи в белорусских владениях Радзивиллов в конце XVIII – начале XIX вв. / О. А. Соболевская // Цайтшрыфт Цэнтра вывучэння гісторыі і культуры яўрэйства на Беларусі. – 2011. – Т. 6. – С. 23 – 40

22. *Teller, A*. Money, power, and influence in eighteenth–century Lithuania: the Jews on the Radziwiłł estates / A. Teller. – Stanford: Stanford University Press, 2016. – 310 p.

23. *Augustyniak, U*. Administracja i życie codzienne w dobrach Radziwiłłów XVI–XVIII wieku / U. Augustyniak. –Warszawa: DiG, 2009. – 288 s.

24. *Stojek-Sawicka, K*. Duchowieństwo katolickie w życiu Radziwiłłów nieświeskich w XVIII wieku / K. Stojek-Sawicka. – Toruń: Wyd. Adam Marszałek, 2011. – 448 s.

25. *Stojek-Sawicka, K*. Duchowni katoliccy w roli prywatnych nauczycieli i wychowawców na dworze Radziwiłłów nieświeskich w XVIII wieku / K. Stojek-Sawicka // Rozprawy z Dziejów Oświaty. – 2006. –T. 45. – S. 209 –229

26. *Швед, В. В*. Масоны і ложы на землях Беларусі (канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.) / В. В. Швед. – Гродна: ГрДУ, 2007. – 275 с.

27. *Sajkowski, A*. Z dziejów teatru nieświeskiego (1746–1762) / A. Sajkowski // Pamiętnik Teatralny Inst. Sztuki PAN. – 1961. – Z. 3 (39). – S. 399–432.

28. *Барышев, Г. И*. Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 290 с.

29. *Некрашэвіч-Кароткая, Ж. В*. Нясвіжская Мельпамена: драматургія Францішкі Уршулі Радзівіл / Ж. В. Некрашэвіч – Кароткая. – Мінск: Прапілеі, 2002. – 210 с.

30. *Радзівіл, Ф. У*. Выбраныя творы: пер. з польск. і франц. / Ф. У. Радзівіл. – Уклад. С. Кавалёў. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2003. – 445 с.

31. *Радзівіл, Ф. У.* Нясвіжскі альбом: зборнік любоўнай лірыкі / Ф. У. Радзівіл. – Мінск: Кнігазбор, 2011. – 141 с.

32. *Русецкая, Н. Л.* Любоўная лірыка Францішкі Уршулі Радзівіл // Веснік БДУ. Серыя 4. – 2006. – № 1. – С. 14–18.

33. *Judkowiak, B.* Franciszka Urszula Radziwiłłowa – w poszukiwaniu własnego głosu: propozycje interpretacyjne, dokumentacyjne i edytorskie / B. Judkowiak. – Poznań: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza, 2013. – 446 s.

34. *Judkowiak, B*. Kostiumy teatru nieświeskiego 1746–1753 / B. Judkowiak // Pamiętnik Teatralny Inst. Sztuki PAN. – 1988. – Z. 3–4. – S. 381–405.

35. *Клецкина, О. С.* Становление и развитие театра Радзивиллов в 1724–1810 гг.: дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / О. С. Клецкина. – Минск, 2017. – 309 л.

36. *Арэшка, В. М.* У пошуках новае прасторы пачуццяў. Некаторыя элементы абсцэну і эротыкі ў творчасці У. Ф. Радзівілавай / В. М. Арэшка // Нясвіж – Гісторыя. Культура. Мастацтва. – Варшава – Мінск, 1998. – С. 66–72.

37. Лібрэта опер Нясвіжскіх кампазітараў XVIII–XIX стагоддзяў / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Творчы калектыў «Беларуская Капэла». – Мінск: Каўчэг, 2017. – 194 с.

38. *Jachimecki, Z.* Antoni Radziwiłł i jego muzyka do «Fausta» / Z. Jachimecki, W. Poźniak. – Kraków: Polskie Wydawnictwo Muzyczne, 1957. – 96 s.

39. *Bieńkowska, I.* Mecenat muzyczny Radziwiłłów w XVIII wieku – od Karola Stanisława do Karola Stanisława «Panie Kochanku» Radziwiłła / I. Bieńkowska // Rocznik Lituanistyczny. – 2015. – T. 1. – S. 171–183.

40. *Bieńkowska, I.* Muzyka na dworze księcia Hieronima Floriana Radziwiłła / I. Bieńkowska. – Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 2015. – 502 s.

41. *Мальдзіс, А. І.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. І. Мальдзіс. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1982. – 254 с.

42. *Królikowski, B.* Wśród Sarmatów: Radziwiłłowie i pamiętnikarze / B. Królikowski. – Lublin: TN KUL, 2000. – 317 s.

43. *Арэшка, В. М.* Дыярыюш Князя Міхала Казімера Радзівіла, Ваяводы Віленскага, Гетмана Вялікага В. К. Літ. / В. М. Арэшка // Спадчына. – 1994. – № 4. – С. 18–47; 1994. – № 5. – С. 37–57; 1995. – № 1. – С. 52–65; 1995. – № 2. – С. 47–76; 1995. – № 4. – С. 35– 60; 1995. – № 5. – С. 135–161; 1995. – № 6. – С. 170–199; 1996. – № 1 – С. 195–223; 1996. –№2. – С. 205–233; 1996. – № 4. – С. 219–250.

44. *Radziwiłł, M.-K.* Podróże litewskiego magnata do Gdańska, Człuchowa, a nawet i dalej...: fragmenty «Diariusza» Michała Kazimierza Radziwiłła «Rybeńki» z lat 1721, 1737 i 1752. – wydał J. Dygdała. – Warszawa: Instytut Historii PAN, 2013. –146 s.

45. *Федорова, И. В*. «Путешествие в святую землю и Египет князя Николая Радзивилла» в русской литературе XVII – начала XVIII века: дис. … канд. фил. наук: 10.01.01 / И. В. Федорова. – Санкт-Петербург, 2000. – 191 л.

46. *Ганчарэнка, С. А.* Грамадска-палітычныя погляды Мікалая Крыштофа Радзівіла «Сіроткі» / С. А. Ганчарэнка // Научные труды Республиканского института высшей школы. – 2013. – Вып. 13, ч. 1. – С. 64–71.

47. Г*анчарэнка, С. А*. Рэлігійныя ўяўленні Мікалая Крыштофа Радзівіла «Сіроткі» на старонках «Перагрынацыі ў Святую зямлю» / С. А. Ганчарэнка // Научные труды Республиканского института высшей школы. – 2014. – Вып. 14, ч. 1. – С. 93–99.

48. *Radziwiłł, K.-S.* Diariusz peregrynacji europejskiej (1684–1687) / K.-S. Radziwiłł. – oprac., wstępem i koment. opatrzył A. Kucharski. – Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2011. – 302 s.

49. *Morawska, T.-K.* Diariusz podróży europejskiej w latach 1773–1774 / T. K. Morawska; wstęp i oprac. B. Rok. – Wrocław: Wydaw. Uniwersytetu Wrocławskiego, 2002. – 259 s.

50. *Chachaj, M.* Zagraniczna edukacja Radziwiłłów od początku XVI do połowy XVII wieku / M. Chachaj. – Lublin: Wydaw. Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 1995. – 171 s.

51. *Mycielski, J.* Książę «Panie kochanku» w świetle własnej korespondencji / J. Mycielski. – Petersburg: K. Grendyszyński, 1898. – 200 s.

52. *Jankowski,* C. Korespondencya księcia Karola Stanisława Radziwiłła wojewody wileńskiego «Panie Kochanku»: 1744–1790 / C. Jankowski. – Kraków: G. Gebethner, 1898. – 315 s.

53. *Waliszewski, K.* Korespondencya ks. Karola Stanisłwa Radziwiłła wojewody wileńskiego «Panie Kochanku» 1762–1790 / K. Waliszewski. – Kraków: [s.n.], 1888. – 176 s.

54. *Kurpiel, A. M.* Pięć listów Łukasza Górnickiego do Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła / A. M. Kurpiel. – Kraków: Ak. Umiejętności, 1903. – 11 s.

55. *Manyś, B.* Radości i troski Anny z Mycielskich Radziwiłłowej w listach do męża Michała Kazimierza Radziwiłła «Rybeńki» / B. Manyś // Kobiece kręgi korespondencyjne w XVII – XIX wieku / red. B. Popiołek, U. Kicińska, A. Słaby. – Warszawa, 2016. – S. 171–185.

56. *Manyś, B.* Relacje Anny Anny z Mycielskich z dziećmi w świetle listów «drugiej pani na Nieświeżu» z lat 1754–1762 / B. Manyś // Acta anniversaria. T. 3: зборнік навуковых прац. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2016. – С. 38–53.

57. *Bajer, J.* Macocha idealna: aktywność Anny Luizy z Mycielskich Radziwiłłowej w świetle francuskiej korespondencji dyplomatycznej (1764–1765) / J. Bajer, A. Mariani // Studia Europaea Gnesnensia. – 2014. – № 10. – S. 281–311.

58. *Rok, B.* Listy Teofili z Radziwiłłów Morawskiej – przykład staropolskiej epistolografii kobiecej / B. Rok // Kobiece kręgi korespondencyjne w XVII–XIX wieku / red. B. Popiołek, U. Kicińska, A. Słaby. – Warszawa, 2016. – S. 187–199.

59. *Rok, B.* Listy Teofili z Radziwiłłów Rozwadowskiej (1738–1807) do bratanka Dominika / B. Rok // Wokół Wielkiego Księstwa Litewskiego i jego tradycji / red. B. Manyś, M. Zwierzykowski. – Poznań, 2016. – S. 201–208.

60. Moda bardzo dobra smażenia różnych konfektów i innych słodkości, a także przyrządzania wszelakich potraw, pieczenia chleba i inne sekreta gospodarskie i kuchenne / oprac. J. Dumanowski i R. Jankowski. –Warszawa: Muzeum Pałac w Wilanowie, 2011. – 273 s.

61. *Aleksandrowicz-Szmulikowska, M.* Radziwiłłówny w świetle swoich testamentów: przyczynek do badań mentalności magnackiej XVI–XVII wieku / M. Aleksandrowicz-Szmulikowska. – Warszawa: Semper, 1995. – 66 s.

62. *Jarczykowa, M.* Przy pogrzebach rzeczy i rytmy: funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku / M. Jarczykowa. – Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego, 2012. – 275 s.

63. *Стоек, К.* Пахавальны цырыманіял пры нясвіжскім двары ў часы Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі / К. Стоек // Arche. – 2015. – № 6. – С. 272–288.

64. *Rok, B.* Człowiek wobec śmierci w kulturze staropolskiej / B. Rok // Acta Universitatis Wratislaviensis. Historia. – 1995. – № 119. – S. 1–123.

65. *Bernatowicz, T.* Miles Christianus et peregrinus: fundacje Mikołaja Radziwiłła «Sierotki» w ordynacji nieświeskiej / T. Bernatowicz. –Warszawa: Neriton, 1998. – 234 s.

66. *Bernatowicz, T.* «Monumenta variis Radivillorum». Wyposażenie zamku nieświeskiego w świetle źródeł archiwalnych. Część I: XVI–XVII wieku. – Poznań: Bogucki Wydawnictwo Naukowe, 1998. – 94 s.

67. *Aftanazy, R.* Nieśwież / R. Aftanazy // Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej / R. Aftanazy. – Wrocław–Warszawa–Kraków, 1992. – Cz. 1, T. 2. – S. 275–305.

68. *Баженова, О. Д.* Радзивилловский Несвиж. Росписи костела Божьего Тела / О. Д. Баженова. – Минск: Харвест, 2010. – 414 с.

69. *Высоцкая, Н. Ф.* Радзивиллы. Несвиж. Замок [Изоматериал] [кн. I – кн. II (из двух частей)] / Н. Ф. Высоцкая. – Минск: Беларусь, 2014.

70. *Бажэнава, В. Д.* Радзівілы. Альбом партрэтаў XVIII–XIX стагоддзяў «Icones Familiae ducalis Radivilianae» / Радзивиллы. Альбом портретов XVIII–XIX вв. «Icones

Familiae ducalis Radivilianae» / В. Д. Бажэнава. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2010. – 522 с.

71. Нясвіжскія зборы Радзівілаў: іх фарміраванне, гістарычны лёс, цяперашняе месцазнаходжанне і шляхі выкарыстання / рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларускі фонд культуры, 2002. – 368 с.

72. *Malejka, A.* Radziwiłłowie a polityka Jana III Sobieskiego w latach 1684–1696 / A. Malejka. – Katowice: Axis Media, 2012. – 191 s.

73. *Мацук, А. В.* Радзівілы і справа аб «нойбургскіх ўладаннях» у 1730–1740-я гады / А. В. Мацук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 3. – С. 15–21.

74. *Мацук, А. В.* Узмацненне канфлікту паміж магнацкімі родамі Сапегаў і Радзівілаў і канчатковае афармленне антырадзівілаўскай кааліцыі / А. В. Мацук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. – № 10. – С. 31–42.

75. *Stojek-Sawicka, K.* Szlachcianki w świecie sarmackim: jak żyły kobiety na dworach szlacheckich w dawnej Polsce? / K. Stojek-Sawicka. – Warszawa: Bellona, 2013. – 293 s.

76. *Pietrzak, J.* Księżna dobrodziejka: Katarzyna z Sobieskich Radziwiłłowa (1634–1694) / J. Pietrzak. – Warszawa: Muzeum Pałacu Króla Jana III w Wilanowie, 2016. – 583 s.

77. *Karkucińska, W.* Anna z Sanguszków Radziwiłłowa (1676–1746): działalność gospodarcza i mecenat / W. Karkucińska. – Warszawa: Semper, 2000. – 391 s.

78. *Dygdała, J.* Codzienne kłopoty, wielkie interesy i podwójna elekcja: korespondencja radziwiłłowskich urzędników z księżną Anną z Sanguszków Radziwiłłową i jej synem Michałem Kazimierzem z 1733/1734 roku / J. Dygdała. – Warszawa: DiG, 2013. – 226 s.

79. *Jastrzębska, M.* Księżna Dominikowa: opowieść o Teofili z Morawskich Radziwiłłowej / M. Jastrzębska. – Łomianki: LTW, 2014. – 222s.

80. *Erbe, G.* Das vornehme Berlin. Fürstin Marie Radziwill und die großen Damen der Gesellschaft 1871–1918 / G. Erbe. Köln. –Böhlau–Verlag, 2015. – 329 s.

81. *Sajkowski, A*. Od Sierotki do Rybeńki: w kręgu radziwiłłowskiego mecenatu / A. Sajkowski. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1965. – 252 s.

82. *Волкаў, М. А.* Артылерыя Нясвіжскага замка / М. А. Волкаў. – Мінск: А. М. Янушкевіч, 2015. – 187 с.

83. *Пярвышын, У. М.* Фартыфікацыі нясвіжскага замка ў канцы XVI–XVIII стст. / У. М. Пярвышын // Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследаванні. Вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый: матэрыялы 1-й міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Нясвіж, 20 кастрычніка 2009 года / ДУ «Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж»; рэдкал.: В. А. Сталярчук (гал. рэд.) [і інш.]. – Нясвіж, 2010. – С. 115–124.

84. *Hundert, Z.* Oddziały Radziwiłłów w wojsku koronnym w dobie panowania «królów rodaków» / Z. Hundert // Radziwiłłowie w służbie Marsa: materiały z konferencji naukowej, Warszawa, 22 – 23 czerwca 2015 r. / Uniwersytet Kardynała S. Wyszyńskiego w Warszawie; red. M. Nagielski, K. Żojdź. –Warszawa, 2017. – S. 257–279.

85. *Ciesielski, T.* Michał Kazimierz Radziwiłł jako dowódca armii litewskiej w latach 1735–1762 / T. Ciesielski // Radziwiłłowie w służbie Marsa: materiały z konferencji naukowej, Warszawa, 22 – 23 czerwca 2015 r. / Uniwersytet Kardynała S. Wyszyńskiego w Warszawie; red. M. Nagielski, K. Żojdź. –Warszawa, 2017. – S. 299–320

86. *Bobiatyński, K.* Michał Kazimierz Radziwiłł jako hetman polny litewski (1668–1680) / K. Bobiatyński // Radziwiłłowie w służbie Marsa: materiały z konferencji naukowej, Warszawa, 22–23 czerwca 2015 r. / Uniwersytet Kardynała S. Wyszyńskiego w Warszawie; red. M. Nagielski, K. Żojdź. –Warszawa, 2017. – S. 229–242

87. *Organiściak, W*. Artykuły wojskowe dla Milicji Karola Stanisława Radziwiłła na tle prawa wojskowego Wielkiego Księstwa Litewskiego / W. Organiściak // Z Dziejów Prawa / Pr. Nauk. UŚl. – Katowice, 2011. –T. 4. – S. 299–319.

88. *Ракуціс, В.* Міліцыя Радзівілаў у XVIII ст. / В. Ракуціс // Arche. – 2012. – № 6. – С. 92–135.

89. *Латушкін, А. М.* Архівісты Нясвіжскага архіва XVII – першай паловы XX ст. / А. М. Латушкін // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. – 2008–2012. – Вып. 6–10.

90. *Buchwald-Pelcowa, P.* Biblioteka Nieświeska Radziwiłłów: fakty, wątpliwości, pytania / P. Buchwald-Pelcowa // Rocznik Biblioteki Narodowej. – Warszawa, 2011. – T. 41. – S. 7–30.

91. *Березкина, Н. Ю.* Книжные собрания Радзивиллов: из истории создания каталогов / Н. Ю. Березкина // Доклады Национальной академии наук Беларуси: журнал. – Минск, 2011. – Т. 55, № 3. – С. 119–122.

92. *Siess-Krzyszkowski, S.* Pierwsza Biblioteka Ordynacka w Nieświeżu i jej znaki własnościowe: (na podstawie bazy danych: Katalog starych druków Biblioteki Ordynacji Nieświeskiej Radziwiłłów. Druki polskie XVI–XVIII wieku) / S. Siess-Krzyszkowski // Rocznik Biblioteki Narodowej. – Warszawa, 2011. – T. 41. – S. 135–160.

93. *Кэмпа, Т.* Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка (1549–1616). Віленскі ваявода: пераклад з польскай / Т. Кэмпа. – Мір: Музей «Замкавы комплекс «Мір», 2016. – 503 с.

94. *Рыбчонак, С. А.* Насельнікі Нясвіжскага замка ў сярэдзіне XIX ст. / С. А. Рыбчонак // Архіварыус: зб. навук.-папул. паведамл. і арт. – Мінск, 2004. – Вып. 2. – С. 71–74.

95. *Скеп'ян, А. А.* Арганізацыя кухоннай службы пры магнацкіх дварах Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. / А. А. Скеп'ян // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.): зборнік навуковых прац міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск – Мір, 6 –8 чэрвеня 2013 г. / Замкавы комплекс «Мір»; пад рэд. А. М. Янушкевіча. – Мінск, 2014. – С. 395–411.

96. *Балайшыце, Л.* Лісты прыдворных мастакоў Гераніма Фларыяна Радзівіла: пра самаўсведамленне і статус мастака / Л. Балайшыце // Arche. – 2015. – № 6. – С. 217–235.

**(Дата падачы: 21.02.2018 г.)**

*Ю. В. Кейко*
Гродненский государственный университет имени Я. Купалы, Гродно
*J. V. Kejko*
Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno

**УДК 94(476.6):271.2:624.51«18»**

# ПОДРЯДНЫЙ СПОСОБ КАК ФОРМА ОРГАНИЗАЦИИ СТРОИТЕЛЬСТВА ПРАВОСЛАВНЫХ ХРАМОВ В ГРОДНЕНСКОЙ ГУБЕРНИИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX ВЕКА

# CONTRACT METHOD AS A FORM OF MANAGEMENT IN CONSTRACTION OF ORTHODOX CHURCHES IN THE GRODNO PROVINCE IN THE SECOND HALF OF THE XIX CENTURY

*В статье раскрывается технология подрядного способа строительства православных храмов в Гродненской губернии во второй половине XIX века.*

*Ключевые слова: подряд на строительство храмов; торги; контракт; Гродненская губерния.*